## *ЮБИЛЕЙНЫЕ ДАТЫ*

# АДДАНАСЦЬ ЛЮБІМАЙ СПРАВЕ

***(да 80-годдзя Матвеева Валерыя Аксенавіча)***

**У. У. СКАРЫНА, Р. М. ПУГАЧОЎ**

*УА «Беларуская дзяржаўная сельсагаспадарчая акадэмія», г. Горкі, Рэспубліка Беларусь, 213407*

*(Паступіла ў рэдакцыю 15.11.2018)*

8 студзеня 2019 года галоўнаму навуковаму супрацоўніку аддзела селекцыі пладовых культур РУП «Інстытут пладаводства», доктару сельскагаспадарчых навук Валерыю Аксенавічу Матвееву спаўняецца 80 гадоў.



В. А. Матвееў нарадзіўся 8 студзеня 1939 г. у горадзе Мінску ў сям'і служачых. Пасля заканчэння сярэдняй школы ў 1956 г. працаваў спачатку рабочым, затым тэхнікам і старэйшым тэхнікам аддзела селекцыі пладовых культур Беларускага навукова-даследчага інстытута пладаводства, агародніцтва і бульбаводства. У гэтым жа годзе ён пачынае вучобу на завочным аддзяленні Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі, а ў 1958 г. перакладаецца на вочнае аддзяленне. Пасля абароны ў 1962 г. дыпломнай працы на тэму «Некаторыя прыёмы павышэння ўстойлівасці сартоў яблыні да захворвання шолудзямі» і заканчэння акадэміі ён накіроўваецца на працу ў Беларускі НДІ пладаводства, агародніцтва і бульбаводства. У далейшым ўся працоўная дзейнасць В. А. Матвеева звязана з гэтым інстытутам (цяпер РУП «Інстытут пладаводства»).

У 1962 г. В. А. Матвееў пачынае сваю навуковую дзейнасць на пасадзе малодшага навуковага супрацоўніка. На працягу 1963–1966 гг. ён вучыцца ў вочнай аспірантуры па спецыяльнасці «Пладаводства» і ў 1968 г. абараняе кандыдацкую дысертацыю на тэму: «Гаспадарча-біялагічныя асаблівасці сартоў слівы Беларускай ССР» пад кіраўніцтвам Э. П. Сюбаравай.

У 1967–1974 гг. Валерый Аксенавіч працуе на пасадзе стаэйшага навуковага супрацоўніка, а ў 1974–1990 гг. загадчыкам аддзела селекцыі пладовых культур. У 1976 г. яму прысвоена званне старэйшага навуковага супрацоўніка па спецыяльнасці «Селекцыя і насенняводства пладовых культур». З 1991 г. і па цяперашні час В. А. Матвееў – галоўны навуковы супрацоўнік аддзела селекцыі пладовых культур РУП «Інстытут пладаводства».

У 1987 г. В. А. Матвееў абараніў доктарскую дысертацыю на тэму: «Культура слівы і шляхі селекцыі новых сартоў ў Беларусі», дзе абагульніў вынікі дваццацігадовых даследаванняў. Ім сабрана і вывучана калекцыя беларускага генафонду роду *Prunus* L. У выніку практычнай селекцыі вывучана нашчадства больш за 40 зыходных сартоў і формаў у больш чым 250 камбінацыях скрыжаванняў. Выяўлена высокая гетэразіготнасць уключанага ў селекцыю зыходнага матэрыялу, установлены асноўныя заканамернасці гаспадарча каштоўных прыкмет і селекцыйная каштоўнасць асобных сартоў і камбінацый скрыжаванняў. Створаны новыя сарты слівы хатняй: Вітебская позняя, Нарач, Далікатная, Кромань, Вянера, Чарадзейка, Вянгерка беларуская, Волат.

Распрацаваны новы для Беларусі кірунак – селекцыя дыплоідных сартоў слівы (гібрыднай алычы). Вывучана эфектыўнасць выкарыстання ў селекцыі розных дыплоідных відаў. Створаны новыя сарты дыплоіднай слівы: Прамень, Мара, Найдзена, Асалода, Лама, Ветразь, Віцьба, Лодва, Ветразь-2, Сонейка, што дазволіла стварыць айчынны прамысловы сартымент гэтай культуры.

Як ахарактарызаваць гэтага чалавека? Выкарыстанне эпітэтаў у дачыненні да яго не заўсёды дастатковa. Хоць большасць пагодзіцца, гэты чалавек варты насіць званне Прафесар, не зважаючы на фармальныя патрабаванні да гэтага звання ў нас. Дык хто- ж ён?

Філосаф, які страляе выразамі не ў брыво, а ў вока. Матэрыяліст з астралагічнай адукацыяй. Разважаючы пра ўплыў месяца на расліны, ён з гумарам кажа, што нават калі пасадзіць расліну ў спрыяльны па месяцовым календары дзень і не даглядаць за ёй, то гэта не значыць, што яна выжыве і дасць багаты ўраджай. Бо ў філасофскай гутарцы аб месячным календары ў гэты час думаецца не пра звычайныя рэчы, а пра высокія матэрыі! Як гэты вучоны муж ўмее мякка апусціць з нябёсаў на зямлю!

Арыгінальным бачыцца яго абгрунтаванне накіраванасці эвалюцыі. Звычайна гэта вельмі любяць карэспандэнты, перадаючы навуковы тэзіс Валерыя Аксенавіча: «Кожная штучна створаная папуляцыя жывых арганізмаў у сваім развіцці імкнецца да сярэднепапуляцыёнага ўзроўню. Так, любы сорт культурнай расліны, пушчаны ў працэсе размнажэння на самацёк, праз шэраг пакаленняў здзічэе. Гэта пачынаюць працаваць спячыя дзікія гены віду. Гэтак жа і з людзьмі. Спыніся працэс акультурвання, і ў нас немінуча прачнуцца гены малпы. Хто-небудзь ці што-небудзь вядзе, гоніць нас у патрэбным накірунку».

Нельга не сказаць пра яго як пра бацьку. Пры гэтым як для сваёй дачкі, доктара сельскагаспадарчых навук, прафесара Н. В. Кухарчык, так і для плеяды выхаваных кандыдатаў і дактароў навук. Сфарміраваўшыся ў навуковай школе Э. П. Сюбаравай як вядучы селекцыянер па сліве і алычы В. А. Матвееў паспяхова працягвае стварэнне сваёй навуковай школы. Пад кіраўніцтвам В. А. Матвеева абаронена 10 кандыдацкіх (М. Р. Мялік, С. Э. Сяменас, М. С. Чыкавані, Р. М. Пугачоў, Л. В. Лёгкая, В. А. Якімовіч, А. А. Таранаў, Т. М. Андрушкевіч, А. В. Поўх, М. М. Васільева) і 2 доктарскія дысертацыі (З. А. Казлоўская, В. А. Самусь). Створаная навуковая школа працягвае прадуктыўную навуковую працу і падрыхтоўку навуковых кадраў па селекцыі пладовых культур, гадавальнікаводству. Можна сказаць, што ў Валерыя Аксенавіча дайшла справа да ўнукаў.

Імпануюць тыя адносіны, якія склаліся ў Інстытуце пладаводства і ў аддзеле селекцыі пладовых культур, не без удзелу Валерыя Аксенавіча. Тут моцныя пачуцці калектыву, узаемадапамогі, агульнай мэты і самааддачы. Трэба садзіць новы сад – усе ідуць садзіць сад. Няпростыя дзевяностыя, трэба «выжываць», карміць свае сем'і – усе ідуць садзіць бульбу.

За шматгадовую плённую працу В. А. Матвееў неаднаразова ўзнагароджваўся шматлікімі Ганаровымі граматамі Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Узнагароджаны медалямі «За працоўную доблесць», «Да 100-годдзя Н. І. Вавілава», сярэбраным медалём ВДНГ.

Валерый Аксенавіч – глыбокі даследчык, таленавіты і мэтанакіраваны, добразычлівы і спагадны чалавек.

Жадаем Валерыю Аксенавічу моцнага здароўя, асабістага дабрабыту, невычэрпнага аптымізму, выканання творчых планаў і поспехаў у працы.

Быць вучнем і калегам Валерыя Аксенавіча Матвеева ганарова і горда!